# ЛІТАРАТУРА

## АЛЕСЬ АНЦІПЕНКА

### ТРЫПЦІХ

**I. Бяз назвы**

*Сказ скажае сказанае,*
*Нявыказаныя думкі*
*Занураюцца ў доўгія сны.*
*Чакаем...*
*Напэўна, усё ж ткі*
*Бессэнсоўна чакаем*
*На ўвайсьцё туды,*
*Дзе сыходзяцца лініі*
*Усіх прадметаў і рэчаў.*
*І дзе зь неакрэсьленых гукаў*
*Нараджаюцца словы.*

**II. Руплівец быцьця**

*На даляглядзе нябытнага*
*Валянцін Акудовіч*
*Рупліва ставіць*
*Памежныя слупы*
*І вешае на іх*
*Шыльды,*
*Каб ніхто не заблукаў*
*У гэтай небясьпечнай зоне.*

**III. Асэнсаваньне Бацькаўшчыны**

*Валянцін Акудовіч*
*Ня ведаў слова «мятлушка»,*
*Таму што ён нарадзіўся*
*На захадзе, а я —*
*На ўсходзе Беларусі, —*
*Вось такая ў нас краіна!*

* * *

I. Сіну

### ТРЫ ЦЬВІКІ

*Сін ня сіні,*
*Сін мне сьніцца.*
*Сіньнявокая сіньніца*
*Не дае мне падавіцца*
*Чорнай, чорнай, чорнай піццай.*
*Цьвік, цьвік, цьвік!*

* * *

---

***Алесь Анціпенка*** *— паэт.*

## БЯЗЬБЕДНЫ ПАЭТ

*Паэт Хадановіч ня жыў на пазыкі,*
*Бо кожнага дня ён пісаў лімэрыкі,*
*А потым, прадаўшы тае лімэрыкі,*
*Да самае раніцы робіць падлікі.*

* * *

## ДАДАІСТЫЧНЫ ВЕРШ

*Абугу, абугу*
*Не скажу я ні гугу.*
*Булка, булка —*
*Га-га-га!*
*Гакі, гакі, гакі, гакі —*
*Е-едзем у вёску мы Булгакі!*

* * *

*Шлях цяжарыць,*
*Цяжарныя жанчыны пакідаюць*
*Акудовіча —*
*Ісьці робіцца крыху лягчэй.*

* * *

*У жабак клопаты*
*Зямныя і вадзяныя.*
*А на неба іх узносяць*
*Бусьлікі.*

* * *

*Заляцеў шпак у шпакоўню,*
*Агледзеўся — аднапакаёўка.*
*Г...но хата.*

* * *

## НАСЬЛЕДАВАНЬНІ БАГУШЭВІЧУ

*Бацьку яго звалі Васіль,*
*Сам жа ён Валянцін.*
*Ні зямлі, ні хаты ня маець,*
*Бо жывець у горадзе.*
*Калі што запытаесься ў яго,*
*Адказваець: «Шукайце мяне ў няма».*
*Славай і багацьцем абкружаны,*
*Сядзіць ён там поруч з князем*
*Астроскім.*
*Сам Скарына чытае ім урыўкі з сваёй*
*Бібліі.*
*Вакол шмат люду літоўскага*
*і беларускага.*
*Пекна і хороша. А як хто новы*
*ўвойдзець туды,*
*Дык таго адразу ж Велікодным яйкам*
*і сустракаюць!*

* * *

*Заўтры зноў народзіцца новы дзень —*
*Не пасьпаваю мыць пялюшкі.*

* * *

## РУСКІ КАЛЯНДАР

*Крестьянин торжествует.*
*Грачи прилетели.*
*Комары да мухи.*
*Болдинская осень.*

* * *

## У ПОШУКАХ СЯБРА

*Па запрашэньні сьвятога Пётры*
*Быў учора ў раі.*
*Акудовіча няма і там.*